Спорт-тайм

СПАРТЫЎНЫЯ ПЕРАМОГІ І ЖЫЦЦЁВАЯ СТРАТА

У штотыднёвым аглядзе «Звязды» традыцыйна расказваем пра самыя актуальныя падзеі выхадных.

1. ***На 48-м годзе пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр Уладзімір Журавель.*** Апошнім месцам работы беларускага трэнера быў карагандзінскі «Шахцёр». Журавель узначаліў казахстанскую каманду ў студзені 2018 года, аднак ужо ў ліпені пакінуў клуб. З тых часоў настаўнік заставаўся без работы. Нагадаем, да гэтага Уладзімір Іванавіч узначальваў брэсцкае «Дынама», «Гомель», мінскае «Дынама» і салігорскі «Шахцёр». З 2010-га па 2013 год чатыры разы запар браў з гарнякамі «серабро» чэмпіянату Беларусі. У 2014-м паўтарыў поспех пяты раз — ужо з мінскім «Дынама». А ў 2017-м прывёз у Брэст Кубак Беларусі. З мінскім «Дынама» Журавель шэсць разоў станавіўся чэмпіёнам Беларусі, а таксама двойчы выйграваў Кубак Беларусі.

2. ***Зборная Беларусі па футболе перамагла на выездзе Сан-Марына — 2:0 і выйшла ў плэй-оф Лігі нацый.*** Галявыя ўдары на рахунку Станіслава Драгуна і Антона Сарокі. Нагадаем, у першым крузе Лігі нацый беларускія футбалісты разграмілі Сан-Марына на полі мінскага стадыёна «Дынама» з лікам 5:0. Затым падапечныя Ігара Крывушэнкі двойчы перамаглі Люксембург — 1:0 (дома) і 2:0 (у гасцях), а таксама два разы згулялі ўнічыю з Малдовай з аднолькавым лікам 0:0. Такім чынам, наша каманда засталася адзінай з 55 удзельнікаў Лігі нацый, хто не прапусціў ніводнага гола на групавой стадыі.

Першае месца ў групе 2 дазволіла беларускім футбалістам выйсці ў лігу С і мець магчымасць у сакавіку 2020 года пазмагацца з трыма іншымі пераможцамі груп у лізе D за права трапіць на чэмпіянат Еўропы 2020 года. У ліку верагодных сапернікаў — Грузія, Македонія, Косава ці Азербайджан. Дакладна сваіх апанентаў беларусы даведваюцца сёння ўвечары

3. ***Футбалісты барысаўскага БАТЭ сталі апошнімі ўдзельнікамі чвэрцьфінальнай стадыі розыгрышу Кубка Беларусі.*** У заключным паядынку 1/8 фіналу чэмпіёны краіны прымалі на полі «Барысаў-Арэны» гасцей з «Гарадзеі» і завяршылі асноўны час унічыю — 0:0. У дадатковыя паўгадзіны забітых мячоў таксама не было, а ў серыі пенальці барысаўчане былі дакладнейшыя — 4:2. Сапернікам БАТЭ ў барацьбе за выхад у паўфінал будзе «Іслач». *Склады астатніх пар 1/4 фіналу:* «Дынама» (Мінск) — «Слуцк», «Шахцёр» (Салігорск) — «Белшына» (Бабруйск), «Віцебск» — «Лакаматыў» (Гомель).

Першыя чвэрцьфінальныя сустрэчы адбудуцца ў сярэдзіне сакавіка 2019 года.

4. ***Марына Слуцкая атрымала ўпэўненую перамогу на Гран-пры па дзюдо ў Гаазе (Нідэрланды).*** У катэгорыі звыш 78 кг беларуска ў фінале ва ўпартай барацьбе справілася з Ванэсай Мбала Атанганай з Камеруна, атрымаўшы ацэнку «іпон».

Адзначым, у бягучым сезоне Марына Слуцкая перамагла на турніры

ў Абу-Дабі і займала прызавыя месцы ў Будапешце і Ташкенце.

Сярэбраную ўзнагароду ў катэгорыі да 100 кг у Гаазе заваяваў і беларус Мікіта Свірыд, які ўпэўнена дайшоў да фіналу, а ў вырашальным паядынку за першае месца саступіў ізраільцяніну Петэру Пальчыку.

5. ***Баскетбалісткі зборнай Беларусі разграмілі каманду Эстоніі (103:63) у гасцявым адборачным матчы чэмпіянату Еўропы 2019 года.*** Самай выніковай у складзе пе-

раможцаў стала Вікторыя Гаспер, якая набрала 25 ачкоў. У першым крузе спаборніцтваў кваліфікацыйнай групы В беларускі абыгралі эстонак у Мінску з лікам 80:63. Акрамя таго, яны двойчы перамаглі зборную Польшчы — 70:62 (у гасцях) і 71:50 (дома), а таксама саступілі турчанкам — 54:64.

У апошнім матчы кваліфікацыі беларускі 21 лістапада згуляюць у гасцях у каманды Турцыі, якая ў 5-м туры выйграла ў гасцях у Польшчы.

Турнірнае становішча перад заключнымі гульнямі: Турцыя — 10 ачкоў, Беларусь — 9, Польшча — 6, Эстонія — 5.

У фінальную частку жаночага Еўрабаскета-2019 выйдуць пераможцы васьмі груп, а таксама шэсць найлепшых зборных, што занялі другія месцы.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.46	17.04	8.18
Віцебск —	8.41	16.48	8.07
Магілёў —	8.36	16.54	8.18
Гомель —	8.26	16.57	8.31
Гродна —	9.00	17.20	8.20
Брэст —	8.54	17.28	8.34

Месяц

Першая квадра 15 лістапада.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Валерыя, Кірылы, Міхаіла, Фёдара, Фядота, Яўгена.*
К. *Анастасіі, Эдзіты, Анатоля, Фелікса.*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Зайшоў ноччу на кухню вады папіць, а там жонка на дыеце сядзіць.

— А ў вас ёсць што-небудзь вегетарыянскае?

— А як жа! Гарэлка з адборных сартоў пшаніцы, піва з ячменю, віно і каньяк з вінаграду!

Чулая пенсіянерка, якая ўсім у пад'ездзе кажа: «Калі раптам госці прыйдуць, прыходзьце да мяне па крэслы», дакладна ведае, у якую кватэру выклікаць нарад пасля 23.00.

Яна:
— У цябе дзяўчына ёсць?
Ён:
— Не.
Яна:
— Цяпер — ёсць.

Жонка работніка ЖКГ летам на два тыдні перастае гатаваць гарачую ежу.

— Фіма, хопіць хадзіць па вуліцы з такім шчаслівым тварам! Гэта проста агідна! На нас жа людзі глядзяць!

caricatura.ru

Даты Падзеі Людзі

20 ЛІСТАПАДА

У краіне

1717 год — нарадзіўся Георгій Каніскі, беларускі царкоўны дзеяч, асветнік, прапаведнік, пісьменнік. У 1743 годзе скончыў Кіева-Магілянскую акадэмію, у 1745—1755 гадах яе выкладчык, прафесар, рэктар. Ініцыятар адкрыцця Магілёўскай духоўнай семінарыі. З 1783 года — архіепіскап магілёўскі, член Святейшага Сінода. Прыхільнік уз'яднання ўніятаў з Рускай праваслаўнай царквой. Свае ідэі выказваў у публічных выступленнях і царкоўных пропаведзях; ім складзена каля 80 прамоў і пропаведзяў. Выступаў за распаўсюджванне асветы ў Беларусі. Аўтар курсаў гістарычных запісак аб Магілёўскай епархіі, інтэрмедый, вершаў і інш. Памёр у 1795 годзе. У 1993 годзе кананізаваны праваслаўнай царквой.

1913 год — нарадзіўся Яўген Міхайлавіч Лабанаў, беларускі фізік, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Аўтар больш як 340 навуковых прац. Навуковыя даследаванні прысвечаны вывучэнню ўздзеяння ядзернага выпраменьвання на паўправадніковыя прыборы. Распрацаваў метады аналізу складу мінералаў, руд і горных парод, метады расшыфроўкі складаных гама-спектраў з прымяненнем ЭВМ. Стварыў радыеізатопныя прыборы для вымярэння шчыльнасці розных асяроддзяў, кантролю аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў у прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Памёр у 1976 годзе.

1948 год — нарадзілася (в. Рудка Пінскага раёна) Яўгенія Янішчыц, вядомая беларуская паэтэса. Аўтар лірычных зборнікаў «Снежныя грамніцы», «Дзень вечаровы», «Ясельда» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Жыццё яе трагічна абарвалася ў 1988 годзе.

У свеце

У 1963 годзе Генеральная Асамблея ААН прыняла Дэкларацыю аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі.

1928 год — нарадзіўся Аляксей Уладзіміравіч Баталаў, папулярны савецкі і расійскі кінаакцёр і рэжысёр, прафесар УДІКа (ВГІКа), народны артыст СССР, прэзідэнт Расійскай акадэміі кінематаграфічных мастацтваў «Ніка», Герой Сацыялістычнай Працы. Зняўся ў фільмах «Ляцяць жураўлі», «Дарагі мой чалавек», «Жывы труп», «Масква слязам не верыць» і многіх іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 2017 годзе.

1945 год — пачаўся Нюрнбергскі працэс над галоўнымі фашысцкімі злачынцамі. Працэс праводзіў Міжнародны ваенны трыбунал, створаны Лонданскім пагадненнем паміж СССР, ЗША, Францыяй і Вялікабрытаніяй, да якога далучыліся яшчэ 19 дзяржаў. Пад суд былі аддадзены 24 ваенныя кіраўнікі фашысцкай Германіі. У ходзе працэсу адбыліся 403 пасяджэнні, заслуханыя паказанні падсудных, 116 сведак, разгледжана больш за 5 тысяч дакументальных доказаў, у тым ліку аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі. Гэта былі паведамленні і акты Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, сведчанні пра знішчэнне савецкіх людзей шляхам заражэння сыпным тыфам у трох канцлагерах на тэрыторыі Палесся, пра расстрэлы жыхароў у Гомелі, Пінску, Лідзе, пра знішчэнне дзяцей у Брэсцкай вобласці. Віна падсудных была цалкам даказаная, і кожны з іх атрымаў свой прысуд. Так упершыню ў гісторыі былі пакараныя арганізатары агрэсіўнай вайны, а агрэсія прызнана найцяжэйшым міжнародным злачынствам.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4170.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 лістапада 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12